ПАГОНЯ

Цэна № — 1 аукс.

ГРАМАДЗКАЯ, ПАЛІТЫЧНАЯ І ЛІТЭРАТУРНАЯ ЧАСОПІСЬ

ВЫХОДЗІЦЬ ЧАСОВА РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Абвесткі ўсялякага размеру прыймаюцца коштам за радок маленькага друку 2 залатых на апошняй страніцы незалежна ад зьместу.

Адрэс рэдакцыі і канторы: Вуліца Адама Міцкевіча, 13-а Тэлефон № 23.

Рэдакцыя адчынена што дзень ад 1—3 гадз. Кантора адчынена што дзень ад 9—3 гадз.

Падпіска каштуе: на 10 №№ уперад — 10 зал. „ 5 „ „ — 5 „ Кошт асобнага № — 1 „

Рукапісы ня прынятыя да друку назад не вертаюцца; прынятыя аплачаваюцца па пагляду Рэдакцыі.

№ 12. | **Коўна, Чацьверг 21 Кастрычніка 1920 г.** | **Год І-шы.**

Коўна, 21 кастрычніка.

Як бытцам нічога новага і ня прынясьлі гэтыя колькі дзён у справе выясьненьня Віленскай авантуры, але, калі прыглядзяцца як мае быць да пязлічных заяў, адозваў і тэлеграм з гэтай прычыны, дык ужо выразна, што Варшава ня толькі прыхільна пагдадае на „працу“ гэнэр. Зэлігоўскага, але і ўмацоўвае, сьцвярджае ярезультаты свайм аўгарытэтам.

Польскі прэмьер Вітос вельмі цынічна заявіў, што захват Вільні ён лічыць нарушэньнем дысцыпліны з боку пэўнай часткі войскаў пад кіраўніцтвам Зэлігоўскага, але калі хто небудзь папробуе гэтыя „нарушыўшыя дысцыпліну“ атрады з Вільні выганяць, то, дадаў Вітос, яму прыдзецца рахавацца з Варшаўскім Урадам. Так можна гаварыць ці да наіўных слухачоў, ці па разбойніцку глумячыся над асновамі міжнародавых адносін. Пан Вітос вельмі добра разумее, што ні дыплёматы Літвы, ні дыплёматы Антанты ня ёсьць наіўныя дзеці і дзеля гэтага трэба толькі прызнаць, што апрыч палітычнага цынізму мы нічога ня можам бачыць у словах п. Вітоса.

Але гэта яшчэ ня ўсё, Мяркуючы па апошнім перадзьвіжэньням атрадаў гэнэрала Зэлігоўскага, эўрапейскі друк выразна заяўляе, што „недысцыплінованаму“ гэнэралу дан з Варшавы прыказ заняць дэмаркацыйныя лініі, устаноўленныя паміж бальшавікамі і Польшчай, што яўна паказвае кіраваньне з Варшавы кожным крокам гэн. Зэлігоўскага. Дзеля таго нас крыху дзівіць, чаму камісыя Лігі Народаў лічыць патрэбнымі хоць якія бы то ні было перагаворы з Урадам гэнэрала Зэлігоўскага, а на проста з Варшавай. „Віленскі Урад Сярэдняй Літвы“ разсылае ва ўсе бакі дэклярацыі і прапановы ўступаць з ім у перагаворы, кіруючы, галоўным чынам, гэтыя прапановы у бок законнага Літоўскага Ураду ў Коўні; да гэтага часу ніхто яшчэ ня прызнаў гэтага Віленскага ўраду і зусім зразумела, што ён вісіць у паветры, але, калі Камісыя Лігі Народаў завядзе з ім афіцыяльныя зносіны—гэта будзе тое ў частцы на палову прызнаньне, катарага так баялася Антанта ў стасунку да бальшавікоў.

З разбойнікам, уварваўшымся ў хату, не вядуць перагавораў ў белых рукавічках; процім яго выпускаюць паліцыю і, калі заява п. Буржуа аб тым, што з гэнэралам Зэлігоўскім можа быць зроблена як са звычайным захватчыкам войдзе ў сілу і будзе праведзена фактычна — толькі такое разрашэньне пытаньня лічыцца намі справядлівым і ядына адпаведным характару стварыўшагося палітычнага мамэнту.

Палітычны бандытызм.

Як ужо было паведамлена ў „Пагоні“ № 10, пэўная кучка „беларускіх дзеячаў“ прыкрыўшыся штандарам „Беларускага Нацыянальнага Камітэту, вядзе флірт з усімі акупантамі, выносячы зараз-жа „лояльныя рэзалюцыі“, пазваляючы сабе ізмену старым сваім ідэалам і, прыстасаваўшыся да новых варункаў, ўкрадываецца такім парадкам у ласку акупантаў, якія таксама з свайго боку падкупляюць «прыхільнасьць» насяленьня, даючы гэтаму гуртку дзеячаў „невялічкія“, праўду сказаць, грошы, аднака-ж не патрабуючы рахункаў. Гэтая кучка «дзеячаў» ужо за два тыдні да прыходу Літоўскай Улады да Вільні вынесла звычайным парадкам «лояльную к літоўцам рэзалюцыю», і пасыпаліся трэбаваньні грошай. Калі падлічыць усе трэбуемыя грошы, то агулам выходзіць больш міліёна марак за „лояльную рэзалюцыю к літоўцам“.

Пан Антон Луцкевіч, былы Міністэр-Прэзыдэнт Беларускай Народнай Рэспублікі, хваліўся перад Міністрам Беларускіх Спраў, што гэта ён сам падсунуў Нацыянальнаму Камітэту ў Вільні зрэдагаваную ім „лояльную рэзалюцыю к літоўцам“, но як літоўцы не яўляюцца акупантамі, а праўдзівымі гаспадарамі сваёй зямлі, „прыхільнасьць насяленьня“ ня купляецца за грошы, як аб гэтым ня ведае пан Антон Луцкевіч і яго сябры.

Ні беларусы Літоўскай Дзяржавы ні самі літоўцы нічога ня мелі-б працу таго, каб п. Антон Луцкевіч і надалей будаваў бы сабе Беларускую Народную Рэспубліку, да якой ідэі маладое дэмократычнае Літоўскае Гаспадарства адносіцца вельмі сымпатычна і прыхільна, а сам Міністр Беларускіх Спраў, будучы членам Літоўскай мірнай дэлегацыі ў Парыжы ўсё зрабіў у Французскім Міністэрстве Заграмічных Спраў, каб упусцілі да Францыі п. Антона Луцкевіча, якога некалькі месяцаў не прапускалі праз граніцу, робячы яму закід, што ў часе нямецкай акупацыі ён працаваў разам з Д-рам Зуземілем, шпіонам самога Гіндэнбурга. Пан Антон Луцкевіч у сучасны момант з'яўляецца „былым“ міністрам—прэзыдэнтам, скінутым самімі беларусамі ў часе, калі ён ездзіў да Варшавы таргаваць беларускай зямлёй.

Некалькі месяцаў стараўся ён пры дапамозе палякаў утрымацца пры „уласьці“ і прабаваў ваеваць з выдзьвінутым тагды беларусамі на міністра—Прэзыдэнта п. В. Ластоўскім, якога пастараўся, як казаў сам уцёкшы ад палякоў да Коўна п. В. Ластоўскі, пасадзіць у польскую турму. Калі ўсе беларусы ад Луцкевіча адвярнуліся, палякі так-сама не захацелі больш вясьці з ім гутаркі.

Сваёй антылітоўскай палітыкай у Польшчы і Парыжы п. Антон Луцкевіч дабіўся толькі таго, што Беларусь цяпер раздзелена паміж Расеяй і Польшчай, а сам ён ужо пачаў праводзіць „лояльныя к літоўцам рэзалюцыі“, але, спаткаўшыся з недаверыем да яго Міністра Беларускіх Спраў, пачаў цяпераха ў Вільні дабівацца сабе месца ў палякоў і кідаецца на ўсе бакі, лічучы, што польскія паны яго, за яго брахню, пагладзяць па шэрсьці.

У сучасны момант.

Заходняя Эўропа, ледзь не захлыснуўшаяся ў крыві ўсясьветнай вайны, вось ужо два гады ходзіць навакол усходняга свайго клубка, які так забрытаўся, што невядома з якога канца прыводзіць яго ў парадак. Савецкія патугі аружжам дацягнуць сваі ідэалы да берагоў Атлантыкі, многа раз, як мядзьведзь на рагаціну, напароваюцца на Польшчу, падтрымліваемую ў барацьбе з бальшавізмам. Гэны апошні, разлегшыся на абшарах Вялікарасеі і Украіны, працяг сваі кіпці і на Беларусь, дзе яму няма асаблівага грунту для красаваньня.

Крок у перад, два назад—так можна ахарактарызаваць дзейнасьць бальшавізму на Беларусі. Дзякуючы такім варункам, тэрыторыя Беларусі стала як бы прахадною,дзе часова і расейскія бальшавікі і польскія паны брудзяць, апотым рэціруюцца, залежна ад „настрою“ другой стараны і ўласных войск.

Калі Прыбалтыцкія народы—Літва, Латвія і Эстія, як знаходзячыяся ў лепшых геаграфічных і палітычных варунках, ужо адбудавалі сваю незалежнасьць і палепшылі быт жыхарства пасьля цяжкай вайны,—беларускі народ гэтага зрабіць да апошняга часу ня можа.

Апрача вышэйпаказанных перашкод, адраджэнью Беларусі, як самастойнай дзяржавы, шкодзілі і іншыя прычыны, першаю з якіх зьяўляецца неарганізаванасьць і непляномернасьць палітычнай працы, праводзімай беларускімі дзеячамі, заусягдашняя нязгода паміж гэтымі дзеячамі—хто ў лес, а хто па дровы,—так працуюць яны; адным з іх падабаецца Варшава са смачнымі цукеркамі, другія вядуць „сваю лінію“, а належнага на, прамку так ніхто з іх і не знайшоў.

А калі сказаць праўду, Беларусь мае многа падставін для разьвіцьця. Найперш тое, што яна знаходзіцца ў самым цэнтры Эўропы, далей Беларусь займае абшар у 280 тысяч кв.кілёметраў, на якім да вайны жыло да 12 міліёнаў насяленьня. На тэрыторыі гэнай праходзяць са сваімі прытокамі такія вялікія рэкі, як Дняпро, Заходняя Дзьвіна, Нёман; тут-жа цягнецца і цэлая сетка каналаў Бярэзінскі, Днепра-Бугскі, Агінскі і інш. Маючы досыць ураджаны грунт, на якім, апрыч розных хлебных засеваў, добра ўдаецца лён, каноплі і іншыя прамысловыя расьліны, Беларусь захавала да апошняга часу вялізарныя лясы, чэкаючыя яшчэ свайго приМененьня.

Эўропа толькі ў частцы паінфармавана аб становішчы беларускага пытаньня: ведаюць аб ёй абмылкова французы, якім палякі расказалі казкі, як аб „Усходніх польскіх крэсах“. Што датычэ Англіі і іншых Заходня-Эўропэйскіх дзяржаў, то яны аб Беларусі зусім мала што ведаюць.

Быў слаўны час, калі Беларусь разам з Літвой выяўлялі вялікае гаспадарства, з моцнаю культурай, развітаю прамысловасьцю, шырокім гандлем. Літоўска-Беларуская дзяржава была грозою для нбодвых сваіх суседаў—Маскоўшчыны і Польшчы. Ня гледзючы

на нескanчоныя войны, якія вяліся з Масквой, Літоўска-Беларуская дзяржава аставалася крэпкаю і багатаю. І толькі тагды настаў палітычны заняпад для Літоўска-Беларускага Народу, калі панская Польшча выступіла „памагаць“ са сваімі уніямі. На нескачаемыя балеваньні польскіх паноў патрэбна было шмат грошаў, а іх у Польшчы як раз і ня было. З працягам часу працоўны скарб Літоўскага-Беларускага Народу паплыў у Польшчу на ўтрыманьне чужынцаў.

Літва змагаецца з ізвечнымі ворагамі, ад іх жа цярпіць яшчэ ў большай меры Беларускі Народ.

Нам здаецца, што ў гэтым змаганьні брацкія народы-Літвін і Беларус—павінны шчыра працягнуць адзін другому руку, каб сумесна адстаяць сваі гістарычныя правы на незалежнасьць і самастойнасьць.

С. Кашчына.

Беларуская хроніка.

Беларускі дзеяч Аляксюк у турме.

КОЎНА, 14. X. (Эльта). Па атрыманым ад беларусаў весткам, з пэўных крыніц, Аляксюк, вядомы беларускі „дзеяч“, спатканы няшчасьцям, ужо каля трох тыдняў сядзіць ў турме ў палякоў. Гэты „дзеяч“, як кажуць, атрымаў ад палякоў каля 900.000 марак „на дробныя выдаткі“ дзеля сваёй працы па прылучэньню беларусаў да палякоў. Як відаць, Аляксюк лічыў сябе за дзьве трэці усей Беларусі, дзеля таго, што толькі 300.000 марак выдаў на патрэбы польскай прапаганды сярод беларусаў, а 600.000 марак заплаціў сабе. Палякі падумалі, што ён столькі не каштуе, і ў рэзультаце Аляксюк папаў у турму.

Новыя акупанты Вільні не пагадзіліся.

ВІЛЬНЯ. 14. X. (Эльта). Ёсьць вядомая ўсяму сьвету прыказка: гдзе два палякі, там тры партыі. Гэта пацьверджаецца і цяпер у Вільні. Ёсьць адны шчырыя эндекі, якія нічога ня хочуць слухаць аб незалежнай Літве, другія падтрымліваюць хаўрус Літвы з Польшчай, трэйція высказываюцца за хаўрус Літвы з Беларусьсю, напрыклад, камандзер другой дывізыі Косьцелкоўскі, высказаўся, што ён ня згодзен з палітыкай цяперашняй улады ў Вільні. Ен жадае толькі таго, каб выбраць Устаноўчы Сойм і ўмовіцца з Літоускай уладай, а другія (напр. Шопо, Бобіцкі, Энгель)—анэксіаністы і кмецяцца навэт заняць Коўно. Косьцелкоўскі казаў навэт, што выйдзе з Вільны з сваёй дывізыяй, калі „Урад ня возьме другога палітычнага напрамку“. Беларусы „Літоускага Ураду“ абецаюць умовіцца з літоўцамі дзеля стварэньня Беларуска-Літоускай Рэспублікі, але гэтаму перашкаджаюць эндэкі. Хто так правіць, на астатку таму павінен быць канец.

У Менску палякі пачалі заігрываць з беларусамі, але, спаткаўшы адпор у шчырых беларусоў, наскора сфарміравалі асобны беларускі урад з польскіх дзеячоў, адны прозьвішча каторых на „скій“ ясна паказваюць на большасьць у гэтым Урадзе польскага элемэнту.

Як мы чулі, п. Ластоўскі ў Рызе ад імені Рады Бел. Нар. Республ. мае выступіць з пратэстам, зьвернутым да урадаў Антанты з прычыны Віленскай авантуры.

На Украйне арганізуюцца асобныя беларускія атрады, да каторых і Украінскі Урад і жыхарства мае вялікі спагад. Гэта выразна паказвае, што нацыанальная свьядомасьць беларускага народу, гдзе бы ён ня быў, і яго гатоўнасьць бараніць сваі правы—далёка пайшлі наперад.

Нзм стала ведама, што п. Ластоўскі ад імені Рады Белар. Нар. Рэспублікіў Рызе адмовіўся ад правоў Беларусі на Вільню, каб наперад ухіліць магчымасьць раздзелу некатарых зямель паміж Сав. Расеяй і Польшчай.

Аб тым, які торг йшоў паміж Сав. Расеяй і Польшчай у часе Рыжскіх перагавораў, сьведчыць хаця-бы такі факт. Польшча патрэбавала ад Сав. Расеі, як грашавую компэнсацыю—400 міліёнаў золатам, а бальшавікі давалі толькі 5 міліёнаў... з гэтай лічбы і пачалі таргавацца.

Сярад украінскіх беларусаў вельмі горача абгаварваецца пытаньне аб мажлівай федэрацыі з літоўскімі беларусамі.

У Вільні падняў галаву і пробуе гаварыць ад імені беларускага жыхарства нейкі Станкевіч, калісь-то атрымаўшы ад польскага Ураду 10000 марак за прапаганду ў бок польскай арыентацыі.

У тым, што Вільня занята са згоды польскага Ураду, цяпераka няма чаго сумлевацца. Рыжэская газэта „Сегодня“ выразна паказвае, што польскім прэдстаўнікoм у Рызе візыруюцца пашпарты асобам, едучым у Вільню. Шыла ў мяшку не схаваеш...

Маленькі фэльетон.

Пішацца так, а выгаварваецца іначай.

Павінен перш-наперш прызнацца, як ня скрытны чэлавек, што ў мяне ёсьць крыху дзіўны пагляд на справу разуменьня самых простых рэчаў, як напрыклад:

Я разумеў так, што калі абяцаюць, то і спаўняюць; калі кажуць адно, та ніяк не магчыма зрабіць другое; калі сказана д о б р а, то гэта не значычь, што н е, ці яшчэ горэй таго: і ні д о б р а і ні н е, а зробіцца так, як будзе выгадней...

Такая архі-лёгіка мне да гэтага часу была недаступна. Але жыцьцё, як відаць, ёсьць такі добры майстар, што здольны ня толькі змагчы такія заданьні ў асобе аднаго зацікаўленага індывідуума на дзьвёх нагах, але прышчапіць і ўмацаваць гэткія разуменьні цэлым обчэствам, грамадам, дзяржавам і каму хочаш.

Так, напрыклад, я пераканаўся ўжо, што некаторыя дзікія народы, калі каму прапануюць зрабіць згоду, гэта значыць, што яны будуць ваяваць яшчэ болей злосна; калі яны кажуць, што „белых“ больш разстрэльваць ня будзем,—гэта значыць, што тэррор павялічыцца; калі яны кажуць, што ў іх жывецца вельмі добра, што ўсе сытыя і адзетыя,— гэта значыць, што у іх горэй-горшага, што ў іх голад і холад.

Але то дзікія народы так робяць, дзікія, ня культурныя, не ўважаючыя на старыя „буржуазныя прэдрассудкі“, падобныя да: сумленьня, шчырасьці, сьвятасьці і г. д.

Аб іх талкаваць ня буду.

Мяне крыху зьбіваюць з панталыку другія пароды людзей, людзей не дзікароў крывавых, а быццам культурных, і, значыцца, яшчэ не скасаваўшых з сваіх жыцьцёвых патрэб: сумленьня, шчырасьці і г. д.

Праўда, што некаторыя культурныя людзі ахрысьцілі гэты спосаб ня проста м а х л я р с т в а м, а д ы п л ё м а т ы е й...

Так, палякі напрыклад, дыплёматычна вельмі міла з Літвою гаворaць словамі, вельмі шмат слоўных абецанак, а на чыне бачым усё ў выглядзе адваротным.

Прыдумана вельмі многа хітрых штук у выглядзе нейкіх „ліній“, як напрыклад „Лінія фоша“, „Лінія Пілсудскага“, „Лінія 8 сьнежня“, „Лінія Кэрзона“.

Адным словам, вельмі многа лініяў, што калі хто заблутаўся ў іх, та мог так адурэць, як у закалдованым калясе.

Самыя напрактыкованныя ўжо дыплёматы са скуры лезьлі, але згаварыцца, я бы сказаў, змахлявацца словамі ніяк не маглі, а на чыне йшлі крывавыя бойкі. Нарэшце, здаецца, зачапіліся за хвост „лініі 8 сьнежня“, каторай ніхто да гэтага часу ня ведае і на словах рашылі затрымацца на рожным берагам гэтай лініі...

Ліга Народаў пачала словамі благаслаўленьне пагадзіўшыхся.

А на чыне бойкі ня сьціхалі, лінію палякі перайшлі, занялі Горадню і Вільню і ідуць яшчэ далей...

Як-жа гэта?!

Та-ж яны згаварыліся? Та-ж павінна было ўсе скончыцца мірам? Там мы ня з дзікарамі гаварылі, а з „культурнейшым“ народам? Ды і Ліга Народаў ня фунт разынкаў, бо і ў ёй ёсьць прэдстаўнік „культурнай Польшчы“?...

Гвалт! Уся сьветны гвалт!

Даю вам шчырае слова, чытач, што калі-б я ня толькі быў П о л ь ш ч а й, калі можна так назвацца, але каб навят быў простым палякам, і так нізка салгаўся-б, то як сумленны чэлавек ды яшчэ ўспомніўшы аб „буржуазных“: сумленьні, гонары, шчырасьці і слове, я бы не задумываючыся скруціў бы моцную вяроўку з тае, што працягнута была лініей 8 сьнежня, і павесіўся-бы на першым паваленым пагранічным стаўбе.

І. Піліпаў.

Грамадзяне!

Трывожныя мінуты пераживае наша Рэспубліка. Чорныя хмары павісьлі над Літвой, але сонца любві нашай да сваёй Бацькаўшчыны і свайго Народу ўжо прарэзалі тэныя хмары і блізка той дзень, калі усе мы ўзноў уздыхнём свабодна і спакойна прымемся да сваей працы. Хто не чэкае гэнага дня? Яго чакаюць усе, але ня кожны дадае ўсіх высілкаў да таго, каб гэты дзень прышоў хутчэй. Ня кожны яшчэ напружыў усе сваі сілы, а Бацькаушчына чакае ахвяр і дапамогі ад кожнага з нас. Калі вы маладыя і свабодныя, ідзіце пад ружжо: пабеждайце або памрыце за сваю Бацькаушчыну, Калі вы ня можэце аддаць сябе—падзяліцеся з Бацькаушчынаю сваімі дастаткамі, сваёй працоунай капейкай. Прыпомніце прыклад гераічнай Бэльгіі, грамадзяне якой аддавалі ўсю сваю маемасьць на справу абароны; трэба, каб будучы гісторык так сама сказаў аб Літве, як аб старонцы, грамадзяне каторый аддалі усё дзеля абароны Бацькаушчыны. Ахвяруйце, хто колькі можа. Адкажыцеся ад роскашы і аддайце лішняе на патрэбы фронту. Калі гэтага будзе мала, адкажыцеся ад самага патрэбнага і аддайце яго фронту. Кожны ваш грош гэта рэальная дапамага, і як бы ён ні быў, малы патрэбен і ён. Ахвяруйце і п а м я т а й ц е, што гэта сьвяты абавязак кожнага. Ахвяры прымаюцца у Міністэрстве Беларускіх Спраў, вул. Міцкевіча, № 13-а.

Беларускі Пешы Батальён.

Ня раз чынам і слозам беларусы вызначалі свой нахіл да блізка—роднага літоўскага народу, і цяпер, калі дзеля абароны Бацькаушчыны патрэбен кожны лішні салдат, з розных сёл і вёсак пачынаюць сьцекацца пад ружжо беларусы.

З малой групкі самаахвотнікаў—беларусаў пачала вырастаць самастойная баевая адзінка і на гэтых днях створаны асобны „Беларускі Пешы Батальён“, куды усё сьцекаюцца і сьцекаюцца новыя самаахвотнікі. Канцэлярыя Штаба Батальёну знаходзіцца на вуліцы Вітаўта, д. № 24 і штодзенна там вядзецца запісь.

Браты-беларусы, сьледуйце прыкладу вашых братоў і калі вы маладыя, маеце сілу, ідзіце грудзямі заступіць Бацькаўшчыну ад страшнага ворага!

У бліжэйшых №№ „Пагоні“ будзе поўнасьцьцю надрукованы тэкст міравой умовы паміж Літвою і Савецкай Расеяй.

Выдавецтва і рэдакцыя: Стол Друку Міністэрства Беларускіх Спраў. Коўна, вуліца Адама Міцкевіча, 13а.

ДРУКАРНЯ А. БАКА і Х. МАНКЕС, КОЎНА.